**УДК 811.161.1'36**

# СЕМАНТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТЭМПАРАЛЬНЫХ НЕВЫТВОРНЫХ ПРЫНАЗОЎНІКАЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

***канд. філал. навук, дац. Г.Ч. РЫЖКОВІЧ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***
***e-mail: annamichalouskaya@mail.ru***

*У артыкуле разглядаюцца семантычныя асаблівасці тэмпаральных невытворных прыназоўнікаў, прыводзіцца іх спіс, вызначаюцца асноўныя тыпы тэмпаральных сінтаксем, якія фарміруюць невытворныя прыназоўнікі, аналізуюцца асаблівасці невытворных прыназоўнікаў з тэмпаральнай семантыкай (іх полісемантычнасць, здольнасць фарміраваць сінтаксемы).*

***Ключавыя словы*****:** *прыназоўнік, невытворны прыназоўнік, семантыка прыназоўніка, тэмпаральнасць, сінтаксема, тэмпаральная сінтаксема.*

**Уводзіны**. У саставе часцін мовы прыназоўнікі вылучаліся ўжо ў антычных граматыках. Да канца XIX ст. ў рускіх граматычных апісаннях у склад прыназоўнікаў лінгвісты ўключалі і прэфіксы. Пачынаючы з другой паловы XX ст. даследаванні катэгорыі прыназоўніка сканцэнтраваліся на яго функцыянальным баку. У працах як беларускіх, так і рускіх лінгвістаў назіраюцца разыходжанні ў дэфініцыях прыназоўніка. Праблемныя кропкі датычацца вызначэння статусу прыназоўнікаў, у якім вылучаецца некалькі падыходаў. Першы – традыцыйны (з пункту гледжання марфалогіі) – разглядае прыназоўнік як службовую часціну мовы. У адпаведнасці з другім падыходам, аўтарам якога з'яўляецца Е. Курыловіч, прыназоўнік – гэта спецыфікаваная марфема. У сучаснай лінгвістыцы прыназоўнік трактуецца як морфасінтаксічная катэгорыя (працы П.П. Шубы, М.І. Канюшкевіч, М.У. Усеваладавай).

Традыцыйна па паходжанні прыназоўнікі дзеляцца на вытворныя і невытворныя. Невытворныя прыназоўнікі, асабліва такія, як *у, на, за, па, да* і інш., мнагазначныя, яны, на думку В.У. Вінаградава, «перагружаныя значэннямі, адрозніваюцца высокай частатой ужывання, могуць спалучацца з некалькімі склонамі іменаў, г.зн. аказваюцца аманімічнымі, выкарыстоўваюцца ва ўсіх стылях пісьмовай і вуснай мовы» [1, с. 555]. Невытворныя прыназоўнікі ў гістарычнай граматыцы вызначаюцца як лакалізатары прасторы. Як слушна адзначае Е.У. Цымбалюк, «выражэнне невытворнымі прыназоўнікамі базавых геаметрычных адносін складае іх інварыянтнае значэнне, а ўтварэнне другасных акалічнасных значэнняў з'яўляецца вынікам метафарызацыі паняцця "прастора"» [2]. Аб'ектам нашага даследавання з'яўляюцца семантычныя асаблівасці тэмпаральных невытворных прыназоўнікаў.

**Асноўная частка**. На працягу доўгага часу значэнне прыназоўнікаў зводзілася толькі да граматычных характарыстык. Гэта было звязана, з аднаго боку, з розным разуменнем прыроды граматычнага значэння, а з другога – з недастатковай вывучанасцю значэння саміх прыназоўнікаў і іх прыналежнасцю да службовых слоў, асноўная функцыя якіх – афармляць падпарадкаванне аднаго знамянальнага слова іншаму ў словазлучэнні і сказе.

Адны навукоўцы (Ф.Ф. Фартунатаў, А.І. Пяшкоўскі, І.І. Мешчанінаў інш.) не прызнаюць за прыназоўнікамі самастойнага лексічнага значэння. Іншыя ж (В.У. Вінаградаў, Н.Ю. Шведава, М.У. Усеваладава, М.І. Канюшкевіч, А.М. Шаранда, Ю.І. Ледзянёў і інш.) не выключаюць наяўнасці ў прыназоўнікаў лексічнага значэння, якое заключаецца ў здольнасці прыназоўнікаў выражаць пэўныя адносіны. Указанне на суаднесенасць прыназоўнікаў са знамянальнымі словамі прыводзіцца ў «Рускай граматыцы-80»: «Лексічным значэннем прыназоўніка як асобна ўзятага слова з'яўляецца значэнне тых ці іншых адносін. Гэтыя адносіны могуць быць або максімальна абстрактнымі, шырокімі, або больш канкрэтнымі і пэўнымі, вузкімі. Аднак у любым выпадку прыназоўнік мае лексічнае значэнне, розная толькі ступень яго абстрактнасці. Семантычна "пустых" прыназоўнікаў не існуе» [3, с. 710]. На наяўнасць у прыназоўнікаў «лексічнага (намінатыўнага) і сінтаксічнага (рэляцыйнага) значэнняў на той падставе, што першае накіравана на абазначэнне рэальных адносін аб'ектыўнай рэчаіснасці, а другое адлюстроўвае здольнасць склонавых словаформаў уступаць у сінтаксічную сувязь з пэўнымі класамі іншых словаформаў і выяўляецца ў патэнцыяльнай сінтаграматычнай валентнасці» [4, с. 6], указвае А.Б. Прахарыхін. А.С. Цой заўважае, што па сваёй граматычнай функцыі прыназоўнік суадносіцца з катэгорыяй склону і, спалучаючыся з пэўным склонам, узмацняе яго значэнне. «Граматычнае значэнне ўтрымлівае ў сабе абагульненае ўказанне на характар сінтаксічных адносін паміж словамі, а лексічнае значэнне вызначае характар ментальных адносін (прасторавых, часавых, кампаратыўных, прычынных, мэтавых і інш.), якія аднаўляюць у свядомасці свет рэальнай рэлятыўнасці. Гэтыя ментальныя (сэнсавыя) адносіны з'яўляюцца агульнымі лексічнымі значэннямі прыназоўнікаў, і яны ўласцівыя ўсім прыназоўнікам. Гэта і вызначае своеасаблівасць семантыкі прыназоўнікаў» [5, с. 107].

Такім чынам, прыназоўнік мае аслабленае лексічнае значэнне, якое залежыць ад кантэксту. Агульнакатэгарыяльнае значэнне прыназоўніка – гэта значэнне рэлятыўнасці (выражэнне розных тыпаў адносін, у тым ліку і тэмпаральных).

Найбольш шырокае семантычнае напаўненне маюць менавіта невытворныя прыназоўнікі, самыя старажытныя па сваім паходжанні. Гэта тлумачыцца стратай генетычнай сувязі з тымі словамі, ад якіх яны ўтвораны.

Старажытныя прыназоўнікі, у адрозненне ад прыназоўнікаў пазнейшага ўтварэння, у большасці сваёй «мнагазначныя і сумяшчаюць самыя разнастайныя, часам нават супярэчлівыя значэнні, якія цалкам раскрываюцца толькі ў складзе тых словазлучэнняў, у якіх яны выступаюць у сваёй службовай функцыі» [6, с. 150]. Значэнне прыназоўніка заключана ў ім самім. Аднак для выяўлення таго ці іншага значэння першаснага прыназоўніка заўсёды патрабуецца кантэкст, мінімальнае слоўнае асяроддзе. Прыназоўнік выражае адносіны паміж словамі як на ўзроўні словазлучэння, так і на ўзроўні сказа. Прыназоўнік не толькі ўтварае адзінкі больш высокага ўзроўню, але і забяспечвае разам з лексічным значэннем слова, яго марфалагічнымі характарыстыкамі і сінтаксічнай пазіцыяй яго сінтаксемнае значэнне. Аналагічна таму, як словаўтваральны фармант утварае новае слова, прыназоўнік разам са словаформай фарміруе сінтаксему [7, с. 105]. У канцэпцыі Г.А. Золатавай сінтаксемай называецца «мінімальная, далей непадзельная семантыка-сінтаксічная адзінка мовы, якая выступае адначасова як носьбіт элементарнага сэнсу і як канструктыўны кампанент больш складаных сінтаксічных канструкцый і характарызуецца пэўным наборам сінтаксічных функцый» [8, с. 4]. Адметнымі прыкметамі сінтаксемы служаць: 1) катэгарыяльна-семантычнае значэнне слова, ад якога яна ўтворана; 2) адпаведная марфалагічная форма і 3) здольнасць сінтаксічна рэалізавацца ў пэўных пазіцыях. Такім чынам, сінтаксема валодае трыма асноўнымі прыкметамі: формай, значэннем і функцыяй [8, с. 9].

Як адзначае М.І. Канюшкевіч, сінтаксема ўключае ў свой склад фармант і лексічны кампанент. Фармант сінтаксемы можа быць выражаны прыназоўнікам у спалучэнні з флексіяй (***у** лесе*), толькі прыназоўнікам (***на** заўтра*) або толькі флексіяй (*лес**ам***). Лексічны кампанент сінтаксемы можа быць выражаны як адным словам, так і цэлай фразай. Прыназоўнік, з'яўляючыся фармантам сінтаксемы, выступае ў ролі маркёра яе сінтаксічнай пазіцыі. Прыназоўнік не проста фарміруе сінтаксему, ён забяспечвае яе значэнне [9, с. 5].

Г.А. Золатава сярод тэмпаральных іменных сінтаксем вылучае:

– тэмпаратыў, г.зн. значэнне, пры якім дзеянне працякае ў межах часавага адрэзка: ***праз** некаторы час, **у** 2006 годзе, **у сярэдзіне** мінулага года* і інш.;

– дыменсіў (розначасовасць), колькасная характарыстыка часу: ***на** 2016 год, **за** пяць дзён **да** пачатку, **за** 15 месяцаў* і інш.;

– дыстрыбутыў, г. зн. значэнне раздзяляльнага часу: ***па** тры стагоддзі, **праз** кожныя тры гадзіны, **па** пятніцах, з дня **ў** дзень* і інш.;

– тэрмінатыў, г. зн. значэнне, пры якім дзеянне працякае на працягу пэўнага часавага адрэзка, прычым заўсёды ўказваецца пачатковая або канчатковая часавыя межы працякаемага дзеяння: ***да** чэрвеня, **з** маленства, **з** панядзелка **па** чацвер* і інш.

Фармантамі дадзеных тэмпаральных сінтаксем з'яўляюцца і невытворныя прыназоўнікі. У беларускіх лексікаграфічных крыніцах і апісаннях намі выяўлена 76 першасных прыназоўнікаў з тэмпаральнай семантыкай: *а* якім часе, *аб* якім часе, *ад* якога часу, *да* якога часу, *з* якога часу, *за* які час, *на* які час, *па* які час, *пасля* чаго, *перад* чым, *сярод* чаго і інш. Трэба адзначыць, што сярод невытворных прыназоўнікаў сустракаюцца адзінкі, якія адносяцца да розных стыляў, гэта зафіксавана ў дыялектных слоўніках беларускай мовы, напр., *аб – об – о*, *ад – од – от*, *ва – во – ува – уво*, *з – із – со – сы*, *к – ак – ік*, *між – межды – между – міжда – міжду – міжды – міжы – міз*, *на – ны*, *па – по*, *пасля – после – посля – прослі*, *праз – пераз – презъ*, *перад – пераз – перэд – прад – прада*, *сярод – серад – серадзі – серэд – серёд – серёдку – сродзь – срэдзь – сярэдзь*, *цераз – церад – церэз – ціраз – черезъ – чыріз – чырыз – чэраз*.

Першасныя прыназоўнікі з'яўляюцца мнагазначнымі. Гэтым абумоўлена іх здольнасць фарміраваць некалькі тыпаў сінтаксем.

Найбольш частотным прыназоўнікам, які ўваходзіць у склад тэмпаратыўных сінтаксем, з'яўляецца першасны прыназоўнік *у*. Гэта звязана з тым, што прыназоўнік *у* з'яўляецца носьбітам самага распаўсюджанага значэння: ён ужываецца пры абазначэнні моманту дзеяння. Прыназоўнік *у* фарміруе некалькі тыпаў тэмпаратыўных сінтаксем: тэмпаратыў-характарызатар (***у** першы чарод*), тэмпаратыў стану (***у** халадку*), тэмпаратыў-лакатыў (***у** будучым*). Лексічны кампанент тэмпаратыўных сінтаксем з першасным прыназоўнікам *у* можа быць выражаны назвамі дзён, месяцаў, свят (*у **свёнтак**, у **пііпаўку**, у **чацвер***), колькасна-іменнымі спалучэннямі (*у **першыя дні**, у **чатыры гадзіны***), падзейнымі назоўнікамі (*у **паншчыну***), назоўнікамі, якія абазначаюць прыродныя з'явы (*у **дождж***). Прыназоўнік *у* можа ўваходзіць у склад дыстрыбутыўна-квантытаўных сінтаксем (*дзень **у** дзень, пяць разоў **на** тыдзень*).

Прыназоўнік *на* фарміруе чатыры тыпы сінтаксем: тэмпаратыўныя, тэрмінатыўныя, дыменсіўныя і дыстрыбутыўныя. У залежнасці ад спосабу выражэння лексічнага кампанента тэмпаратывы дзеляцца на ўласна тэмпаратывы (*Прыехаць **на каляды***), тэмпаратывы даты (***На першае верасня** штат фірмы складаў 10 штатных адзінак* (са справаздачы) [10], храналагічныя тэмпаратывы (***На трэціх сутках** далі нам па дзвесці грам хлеба* [10] і тэмпаратывы паўтаральнага дзеяння (***На першы раз** злодзею даравалі* [Інт.]. Прыназоўнік *на* можа ўводзіць тэмпаратыўныя таксісныя сінтаксемы: *Цвёрда трымаўся юнак **на дапросе*** (А. Куляшоў) [11]. У тэрмінатыўных сінтаксемах лексічны кампанент выражаны прыслоўямі: *У лінгвістыцы тэксту **на сёння** наглядна вылучаюць два асноўныя напрамкі* (В.І. Іўчанкаў) [10]. ***На пазаўтра**, як я ўстаў, увесь горад аблятаў* (К. Крапіва) [11]. Лексічны кампанент дыменсіўных і дыстрыбутыўных сінтаксем у большасці выпадкаў выражаны назоўнікамі, якія абазначаюць адзінкі часу. Напр., дыменсіўныя сінтаксемы: *Мы з таго пакалення, з кагорты байцоў, ні **на хвілю***

*не можам мы вешаць галоў* (А. Куляшоў) [11]; дыстрыбутыўныя сінтаксемы: *тры разы **ў** дзень*. Прыназоўнік *на* можа ўводзіць сінтаксему з прасторава-часавай семантыкай: *Спыніўся **на паўслове*** [10].

Прыназоўнік *па* фарміруе тэмпаратыўныя (*пачынаецца **па вясне**, шлі **па ночы***), дыменсіўныя (*не палілі ў печы **па году**, не знаходзіў **па цэламу месяцу***), дыстрыбутыўныя сінтаксемы (*збірацца **па панядзелках**, раздаваць **па святах***). Асаблівасцю прыназоўніка *па* з’яўляецца яго здольнасць фарміраваць сінкрэтычныя тыпы сінтаксем: тэрмінатыўна-дыменсіўныя (***па век вякоў**, **па смерць** не веру*) і дыменсіўна-дыстрыбутыўныя (*пражылі **па добраму валоваму вяку**, гуляць **па марозе***).

Прыназоўнік *за* з’яўляецца фармантам трох тыпаў сінтаксем: тэмпаратыўных (*выпуск **за 2010 г.**, было **за поўнач**, **за недалёкім часам** гвардыі падпалкоўніка, **за польскім часам***), дыменсіўных (***жыццё** трох-чатырох пакаленняў, падмарозіла **за ноч***) і тэрмінатыўных (*касілі **аж за поўдзень**, размова зацягнулася **за шарую***).

Аналагічныя тыпы сінтаксем фарміруе прыназоўнік *з*. Тэмпаратыўнае значэнне сінтаксем з дадзеным прыназоўнікам ускладняецца камітатыўным (*устаць **з зарою***). У тэрмінатыўных сінтаксемах прыназоўнік абазначае кропку адліку, пачатковую кропку падзеі або дзеяння (*помніць **з маленства**, закахацца **з першага погляду***). Дыменсіўныя сінтаксемы з прыназоўнікам *з* уключаюць у склад лексічнага кампанента ад’ектыў *кожны* (***з кожным** крокам, **з кожным** днём*).

Прыназоўнік *праз* з’яўляецца фармантам тэмпаратыўных (*прыйсці **праз паўтары гадзіны***), дыменсіўных (*вучыўся **праз усе дзесяць гадоў**, жыла **праз цэлы дзень***) і дыстрыбутыўных сінтаксем (*званіў **праз кожныя паўгадзіны***). Прыназоўнік *праз* можа таксама фарміраваць квантытаўна-тэмпаратыўныя сінтаксемы (*назначаюць **15–20 ваннаў праз 1–2 дні**, прыедзе **месяцы праз два***).

Тэмпаратыўныя, тэрмінатыўныя і дыстрыбутыўныя сінтаксемы фарміруе прыназоўнік *ад*. Першасны прыназоўнік *ад* з’яўляецца фармантам тэмпаратыўных сінтаксем са значэннем даты (*ліст **ад 25 чэрвеня 1975 года***). У складзе тэрмінатыўных сінтаксем прыназоўнік *ад* спалучаецца з тэмпаральнымі і падзейнымі назоўнікамі (*ад **раніцы**, ад **вяселля***). У дыстрыбутыўных сінтаксемах прыназоўнік займае інтэрпазіцыю (*дзень **ада** дня*).

Прыназоўнікі *да*, *к* фарміруюць два тыпы сінтаксем: тэмпаратыўныя (*працавалі **да зары**, уставалі **да сонейка**, схіляецца дзень **к надвячорку**, збіралася **к ночы** на дождж*) і тэрмінатыўныя (*дажыць **да світання**, працавалі **да цямна**, выканаць **к панядзелку**, зніжаецца **к 5 гадам***).

Прыназоўнік *пасля* – фармант тэмпаратыўных (***пасля** заручын, **пасля** размовы*) і тэмпаральна-лакатыўных сінтаксем (***пасля** павароту*).

Фармант *аб* фарміруе тэмпаратыўныя (*настройваў **аб** гэту пору, сустрэнемся **аб** шостай гадзіне*) і дыменсіўныя сінтаксемы (*звыкаўся **аб** дзень, загарацца **аб** адным дні*).

Такім чынам, мнагазначнасць першаснага прыназоўніка абумоўлівае яго здольнасць фарміраваць некалькі тыпаў тэмпаральных сінтаксем.

Адзначым і такую асаблівасць першасных прыназоўнікаў, як здольнасць вызначаць семантыку фарміруемых імі сінтаксем. Разгледзім гэта на прыкладзе прыназоўнікавых спалучэнняў з базавым кампанентам *перыяд*.

Семантыка сінтаксем залежыць ад першаснага прыназоўніка. Так, тэмпаратыўныя сінтаксемы фарміруюцца спалучэннем базавага кампанента *перыяд* у форме вінавальнага і меснага склонаў з прыназоўнікамі *ў*, *на*: ***У перыядзе рэканвалесцэнцыі** магчымае развіццё полінеўрыту, які суправаджаецца зніжэннем адчувальнасці* [10]. ***У перыяд падрыхтоўкі вучняў да экзаменаў** неабходна ўзмацніць увагу да рэжыму дня* [Інт.]. ***У перыяд ранняга дзяцінства** чалавек лёгка і ахвотна ўспрымае «казачную» форму тлумачэння таго, што адбываецца навокал* [Інт.]. *Менавіта **ў перыяд панавання протарэнесанса у канцы XIV ст.** насельніцтва гістарычнай Літвы прыняла хрышчэнне па каталіцкаму абраду* [Інт.]. ***На перыяд восеньскіх канікул** ва ўстановах адукацыі была аб’яўлена акцыя «Нясумныя канікулы»* [Інт.].

Фарманты тэрмінатыўных сінтаксем уключаюць у свой састаў базавы кампанент *перыяд* у форме роднага склону і прыназоўнікі *з* або *ад*. Напр., *Першыя літаратурныя спробы Змітрака Бядулі адносяцца **да перыяду вучобы ў ешыбоце**, калі трынаццацігадовым падлеткам ён пачаў пісаць вершы на старажытнаяўрэйскай мове* [Інт.]. *У беларусаў і іншых еўрапейскіх народаў старажытнае земляробчае свята найбольшага росквіту жыватворных сіл прыроды, прымеркаванае **да перыяду летняга сонцастаяння*** [Інт.]. ***Пачынаючы з перыяду «Нашай волі»**, тэма горада ў паэзіі Танка выступае радзей і не інакш, як толькі ў сувязі з праблемай вёскі* [Інт.].

Дыменсіўныя сінтаксемы фарміруюцца фармантамі, у састаў якіх уваходзяць базавы кампанент у форме вінавальнага склону і першасныя прыназоўнікі *за*, *на*: ***За перыяд май–кастрычнік 2014 года** ў БДУ выдадзена каля 40 кніг* [Інт.]. ***За перыяд дзеяння праграмы** бударганізацыямі рэспублікі было набыта 13 тыс. 685 адзінак тэхнікі* [Інт.]. *Фарміраванне беларускага этнасу ў большасці прыйшлося **на перыяд Вялікага княства Літоўскага** і працягвалася ў наступны час, паколькі этнічныя працэсы не маюць перапынкаў* [Інт.]. *Абарончая сістэма Мірскага замка гатычнага перыяду ўяўляла сабой рэдкае спалучэнне самых сучасных **на перыяд яго будаўніцтва** (нават эксперыментальных)* [Інт.].

**Заключэнне.** Такім чынам, адной з прыкмет прыназоўніка як часціны мовы з’уляецца наяўнасць у яго аслабленага лексічнага значэння, якое залежыць ад кантэкста. Агульнакатэгарыяльнае значэнне прыназоўніка – гэта значэнне рэлятыўнасці (выражэнне розных тыпаў адносін, у тым ліку і тэмпаральных). Мнагазначнасць невытворных прыназоўнікаў абумоўлівае іх здольнасць фарміраваць некалькі тыпаў тэмпаральных сінтаксем, пры гэтым адзін і той жа прыназоўнік можа ўтвараць болей чым адзін тэмпаральны тып сінтаксем або сумяшчаць у сабе некалькі сінтаксемных значэнняў у адным выказванні.

## ЛИТЕРАТУРА


1. Виноградов, В.В. Русский язык : учеб. пособие для вузов по спец. «Русский язык и литература» / В.В. Виноградов. – М. : Высш. шк., 1986. – 616 с. (Грамматическое учение о слове)
2. О семантике непроизводных предлогов / Е. В. Цымбалюк // Современное образование: теория и практика / С.Л. Данильченко [и др.]. – Уфа : Аэтерна, 2017. – С. 268–273.
3. Русская грамматика. В 2 т. / под ред. Н. Ю. Шведовой. – Уфа, М. : Наука, 1980. – 2 т.
4. Прохорихин, А.Б. О значении и синонимии первичных предлогов, обозначающих пространственные и временные отношения : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / А.Б. Прохорихин ; Калин. гос. ун-т. – Калинин, 1974. – 22 с.
5. Цой, А.С. Предлог как лексическая единица русского языка и его отражение в учебном словаре / А. С. Цой // Филологические науки. – 2004. – № 4. – С. 105–113.
6. Федосеева, Л.Н. Предлоги современного русского языка, выражающие пространственные отношения: функционально-семантический аспект / Л.Н. Федосеева // Филологические и педагогические аспекты гуманитарного образования в неязыковых вузах : сб. материалов III межрегион. науч.-практ. конф. с междунар. участием, Рязань, 24–25 мая 2019 г. / под общ. ред. Л.Н. Федосеевой. – Рязань : Академия ФСИН России, 2019. – С. 147–151.
7. Конюшкевич, М.И. Способы выражения лексического компонента синтаксемы (синтаксической позиции), маркированной предлогом (на материале белорусского языка) / М.И. Конюшкевич // Е.Ф. Карский и современное языкознание : материалы X междунар. Карских чтений, Гродно, 16 –17 мая 2005 г. : в 2 ч. / отв. ред. М.И. Конюшкевич. – Гродно, 2005. – Ч. 1. – С. 104–116.
8. Золотова, Г.А. Синтаксический словарь: репертуар элементарных единиц русского синтаксиса / Г.А. Золотова. – М. : Наука, 1988. – 386 с.
9. Конюшкевич, М.И. Синтаксемообразующая функция предлога и механизмы опредложивания знаменательной лексики / М.И. Конюшкевич // Вопросы функциональной грамматики : сб. науч. тр. / под ред. М.И. Конюшкевич. – Гродно, 2005. – Вып. 5. – С. 3–19.
10. Канюшкевіч, М.І. Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання : матэрыялы да слоўніка : у 3 ч. / М.І. Канюшкевіч. – Гродна : ГрДУ, 2008–2011. – 3 ч.
11. Шуба, П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П. Шуба. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 168 с.


## REFERENCES


1. Vinogradov, V.V. (1986). *Russkii yazyk: (Grammaticheskoe uchenie o slove)*. Moscow: Vyssh. shk. (In Russ.).
2. Tsymbalyuk, E.V. (2017). O semantike neproizvodnykh predlogov [On the semantics of non-derivative prepositions]. In Eds. S.L. Danil'chenko *Sovremennoe obrazovanie: teoriya i praktika [Modern education: theory and practice]* (268–273). Ufa: Aeterna. (In Russ.).
3. *Russkaya grammatika* (1980). Eds. N.Yu. Shvedova. (In 2 Vol.) Moscow: Nauka. (In Russ.).
4. Prokhorikhin, A.B. (1974). *O znachenii i sinonimii pervichnykh predlogov, oboznachayushchikh prostranstvennye i vremennye otnosheniya*. Kalinin, 1974. (In Russ.).
5. Tsoi, A.S. (2004). Predlog kak leksicheskaya edinitsa russkogo yazyka i ego otrazhenie v uchebnom slovare [Preposition as a lexical unit of the Russian language and its reflection in the educational dictionary]. In *Filologicheskie nauki [Philological Sciences], (4),* 105–113. (In Russ.).
6. Fedoseeva, L.N. (2019). Predlogi sovremennogo russkogo yazyka, vyrazhayushchie prostranstvennye otnosheniya: funktsional'no-semanticheskii aspect [Prepositions of the modern Russian language expressing spatial relations: functional and semantic aspect]. In *Filologicheskie i pedagogicheskie aspekty gumanitarnogo obrazovaniya v neyazykovykh vuzakh : sbornik materialov III mezhregional'noi nauchno-prakticheskoi konferentsii s mezhdunarodnym uchastiem* [*Philological and pedagogical aspects of humanitarian education in non-linguistic universities : collection of materials of the III interregional scientific and practical conference with international participation],* (147–151). Ryazan': Akademiya FSIN Rossii. (In Russ.).
7. Konyushkevich, M. I. (2005). Sposoby vyrazheniya leksicheskogo komponenta sintaksemy (sintaksicheskoi pozitsii), markirovannoi predlogom (na materiale belorusskogo yazyka [Ways of expressing the lexical component of a syntaxeme (syntactic position) marked with a preposition (based on the material of the Belarusian language)]. In M.I. Konyushkevich (Eds.) *E.F. Karskii i sovremennoe yazykoznanie [E. F. Karsky and Modern Linguistics],* (In 2 Pat., Pat. 2, 104–116) Grodna. (In Russ.).
8. Zolotova, G.A. (1988). *Sintaksicheskii slovar': repertuar elementarnykh edinits russkogo sintaksisa.* Moscow: Nauka. (In Russ.).
9. Konyushkevich, M.I. (2005). Sintaksemoobrazuyushchaya funktsiya predloga i mekhanizmy opredlozhivaniya znamenatel'noi leksiki [Syntaxemo-forming function of preposition and mechanisms of significant vocabulary definition]. *Voprosy funktsional'noi Grammatik [Questions of functional grammar], (5),* 3–19. (In Russ.).
10. Kanyushkevich, M.I. (2008–2011). *Belaruskiya prynazouniki i ikh analagi. Gramatyka real'naga uzhyvannya : materyyaly da slounika Belaruskiya prynazonniki i ix analagi.* Grodna: GrDU. (In Belaruss.).
11. Shuba, P.P. (1993). *Tlumachal'ny sloўnik belaruskikh prynazoўnikaў.* Minsk: Nar. Asveta. (In Belaruss.).


*Паступіў 15.09.2021*

## СЕМАНТИЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ ТЕМПОРАЛЬНЫХ НЕПРОИЗВОДНЫХ ПРЕДЛОГОВ В БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

***А.Ч. РЫЖКОВИЧ***

*В статье рассматриваются семантические особенности темпоральных непроизводных предлогов, приводится их список, определяются основные типы темпоральных синтаксем, формируемых непроизводными предлогами, анализируются особенности непроизводных предлогов с темпоральной семантикой (их полисемантичность, способность формировать синтаксемы).*

***Ключевые слова:*** *предлог, непроизводный предлог, семантика предлога, темпоральность, синтаксема, темпоральная синтаксема.*

## SEMANTIC FEATURES OF TEMPORAL NON-DERIVATIVE PREPOSITIONS IN THE BELARUSIAN LANGUAGE

***H. RYZHKOVICH***

*The article considers the semantic features of temporal non-derived prepositions, provides a list of them, defines the main types of temporal syntaxems that form non-derived prepositions, analyzes the features of non-derived prepositions with temporal semantics (their polysemanticity, the ability to form syntaxems).*

***Keywords*****:** *preposition, non-derived preposition, preposition semantics, temporality, syntaxeme, temporal syntaxeme.*